*С. А. Захаркевіч,*
*дацэнт БДУ (г. Мінск), кандыдат гістарычных навук*

# ЭТНІЧНЫЯ ВОБРАЗЫ БЕЛАРУСІ Ў АПІСАННЯХ АФІЦЭРАЎ ГЕНШТАБА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў 40-х — ПАЧАТКУ 50-х гг. XIX ст.

Напрыканцы XVIII ст. беларускія землі былі далучаны да Расійскай імперыі. Значная тэрыторыя з незнаёмымі для расіянаў культурнымі традыцыямі і новымі этнічнымі групамі апынуліся пад кантролем імперскіх улад. Гэта выклікала пэўную цікавасць перш за ўсё у вайсковых эліт Расійскай імперыі, якія імкнуліся вывучыць і зразумець стратэгічныя і тактычныя рэсурсы здабытых тэрыторый.

Менавіта вайсковая спрошчанасць і лаканічнасць дае падставу звярнуцца перш за ўсё да спрошчаных мадэляў разумення новых тэрыторый і новых этнічных груп. Таму аналіз «Ваенна-статыстычных аглядаў», прысвечаных беларускім землям і падрыхтаваных у канцы 40-х — пачатку 50-х гг. XIX ст., з'яўляецца вельмі важнай і актуальнай навуковай задачай, вырашэнне якой дапаможа зразумець падмуркі стварэння спрошчаных, стэрэатыпаваных уяўленняў аб беларусах і этнічных меншасцях Беларусі, што былі распаўсюджаны ў Расійскай імперыі і, магчыма, існуюць да сучаснасці.

На думку вядомай расійскай даследчыцы В. Бяловай «намаляваць для сябе партрэт «чужынца» — суседа, чужаземца ці іншаверца — гэта значыць у пэўным сэнсе ўсвядоміць самое сябе, уласную ўнікальнасць і своеасаблівасць» [1, с. 7].

Вывучэнне этнічных вобразаў і разуменне працэсу іх стварэння з'яўляецца важнай задачай. Па-першае, менавіта на падставе гэтых вобразаў адбываюцца міжкультурныя кантакты. Па-другое, некалькі дзесяцігоддзяў у XIX ст. этнічныя вобразы этнічных груп Беларусі, закладзеныя ў «Ваенна-статыстычных аглядах Расійскай імперыі», аказвалі значны ўплыў на ўспрыняцце насельніцтва беларускіх зямель элітамі Расіі і, ускосна, на прыняцце палітычных рашэнняў адносна гэтых этнічных супольнасцей.

Нягледзячы на даволі значныя палітычныя і эканамічныя адносіны паміж беларускімі землямі Рэчы Паспалітай (далей РП) і Расійскай імперыяй да падзелаў РП, этнічная (і ў пэўным сэнсе канфесійная) структура беларускіх зямель як стратэгічны і тактычны рэсурс не быў добра вядомы палітычным і ваенным элітам Расіі. У сувязі з гэтым расійскія ўлады распачалі шэраг мерапрыемстваў па зборы стратэгічных і тактычных звестак аб насельніцтве і рэгіёнах далучаных зямель.

Ваенная акадэмія і Генеральны штаб Расійскай імперыі шукалі ўласныя формы ўліку і апрацоўкі геаграфічных, статыстычных і этнаграфічных матэрыялаў. Вялікі ўплыў на гэты працэс аказалі палкоўнік Языкоў і прафесар кафедры ваеннай геаграфіі і статыстыкі Імператарскай ваеннай акадэміі Д. А. Мілюцін (дарэчы, былы ваенны міністр Расійскай імперыі і генерал-фельдмаршал). Языкоў у выдадзеным ў 1838 г. «Вопыце ваеннай геаграфіі», а Д. А. Мілюцін у «Першых вопытах ваеннай статыстыкі» (1847—1848) распрацавалі прынцыпы, якія ляглі ў падмурак ваенна-статыстычных аглядаў па сарака трох губернях і абласцях Расіі, якія былі рэалізаваны ў практычных ваенных мэтах [2, с. 288].

У 1846 г. у працы «Крытычнае даследаванне значэння ваеннай геаграфіі і ваеннай статыстыкі» Д. А. Мілюцін сфармуляваў мэты збору матэрыялаў у гэтай сферы: «Для гэтага неабходна, з аднаго боку, разгледзець, так бы мовіць, уласна сам інструмент вайны, гэта значыць узброеныя сілы і ўсё, што мае ўплыў на іх арганізацыю, забеспячэнне, утрыманне, на вобраз іх дзеянняў супраць ворага; з другога боку — даследаваць тыя мясцовыя даныя, якія на самым тэатры вайны, супраць той ці іншай дзяржавы, павінны мець уплыў на план ваенных дзеянняў, а праз гэта і на іх поспех» [8, с. 37].

Першыя ваенна-статыстычныя матэрыялы афіцэры Генштаба сталі збіраць яшчэ ў 40-х гг. XIX ст.: у 1848 г. падпалкоўнік Нордэнстрэн па Віленскай губерні, капітан Чарніцкі па Магілёўскай, паручык Стрэн па Мінскай;у 1849 г. палкоўнік Калмберг па Гродзенскай губерні; а ў 1852 г. генерал-маёр Без-Карніловіч па Віцебскай губерні. Гэта былі тыповыя працы, якія мелі агульную структуру. Яны складаліся з дзвюх частак: агульнай і спецыяльнай. У першую ўваходзілі пяць раздзелаў: агульны погляд на губерню; апісанне мясцовасці; агульная характарыстыка жыхароў; прамысловасць; адукаванасць. Другая частка складалася з трох раздзелаў: апісанне мясцовасцей, прыдатных для размяшчэння войскаў; правіянтныя рэсурсы і мабілізацыйныя магчымасці.

Ва ўсіх працах характарыстыка жыхароў рабілася на падставе этнічнага (у працах «племяннога»), моўнага і рэлігійнага прынцыпаў. Традыцыйна афіцэры вылучалі славянскае насельніцтва, у якое ўключалі беларусаў, палякаў і рускіх. Аднак падпалкоўнік Нордэнстэрн у апісанні Віленскай губерні праваслаўных беларусаў называе рускімі, а каталікоў «прыроднымі літоўцамі» [3, с. 62], капітан Чарніцкі ў апісанні Магілёўскай губерні вылучае «туземцаў», да якіх аднёс патомкаў хазараў, крывічоў і радзімічаў [6, с. 57], а паручык Стрэн назваў бела-

русаў Мінскай губерні рускімі і палякамі, маючы на ўвазе праваслаўных і каталікоў [5, с. 32].

Беларусы ўвогуле атрымалі ў ваенна-статыстычных апісаннях негатыўныя характарыстыкі. Палкоўнік Калмберг, апісваючы беларусаў Гродзенскай губерні, кажа аб тым, што яны «захоўваюць грубыя норавы, схільныя да весялосці, распусты і п'янства; таксама мелі цягу да злосці». Ён вылучыў іх паслухмянасць і «частковую працавітасць» [4, с. 63]. Падпалкоўнік Нордэнстэрн пісаў, што «просты народ бедны, лянівы, неахайны, схільны да п'янства і неверагодна неадукаваны» [3, с. 23]. На думку паручыка Стрэна беларусы Мінскай губерні жывуць бедна з-за ляноты і схільнасці да п'янства [5, с. 33]. Капітан Чарніцкі ў дачыненні да беларусаў Магілёўскай губерні падаў цалкам негатыўны вобраз: «Агульны дух беларускіх просталюдзінаў заслугоўвае жалю. Схільнасць да п'янства, гультайства і недастаткова развітыя ўяўленні аб уласнасці робяць іх лянівымі, схільнымі да крадзяжу, хітрасці, ашуканства, баязлівасці ... З другога боку, яны спакойныя, пакорлівыя, паслухмяныя і здольныя пераносіць цяжкасці і непрыемнасці жыцця бестурботна...» [6, с. 58].

Значная ўвага надавалася афіцэрамі Генштаба характарыстыцы палякаў на беларускіх землях. Палкоўнік Калмберг у апісанні Гродзенскай губерні заўважаў, што яны смелыя, сварлівыя, не вельмі ахвочыя да працы і любяць гарэлку і піва [4, с. 63].

Ва ўсіх апісаннях прысутнічалі нататкі аб яўрэях. Усе афіцэры падкрэслівалі значную колькасць гэтай этнічнай супольнасці, іх рэлігійную своеасаблівасць. У працы, прысвечанай Гродзенскай губерні, палкоўнік Калмберг адзначаў: «Нягледзячы на працяглае жыццё сярод іншых народаў, яны захавалі вернасць уласным абрадам і звычаям» [4, с. 64]. Падпалкоўнік Нордэнстэрн пісаў аб яўрэях Віленскай губерні: «Адукацыя знаходзіцца на самым нізкім узроўні. Хітрасць, мана, ліслівасць характэрна для іх з дзяцінства» [3, с. 24]. Яўрэі Мінскай губерні, на думку паручыка Стрэна, нічым не займаліся і знаходзіліся ў вельмі цяжкім эканамічным становішчы [5, с. 33]. Капітан Чарніцкі ў апісанні яўрэяў Магілёўскай губерні намаляваў дуалістычны вобраз, у якім спалучыў стэрэатыпнае ўспрыняцце яўрэйскага насельніцтва з рэальным становішчам рэчаў. З аднаго боку, яўрэі, на думку аўтара, маюць галоўную загану — «імкненне да падману і схільнасць да ляноты» [6, с. 61]. З другога боку, яны занятыя рознымі рамёствамі, гандлем і фактарскімі справамі. Значная колькасць яўрэяў «у апошні час змяніла ўласнае адзенне на рускае плацце ці нямецкі пакрой, многія пачалі галіць бараду і вусы» [6, с. 60].

Вельмі негатыўна фіксаваўся вобраз цыганскай супольнасці Беларусі. У Гродзенскай губерні, на думку Калмберга, цыганоў больш за ўсё ў Слонімскім павеце, дзе яны «нічога не робяць, адно лянуюцца, не маюць пастаяннага месца жыхарства, лечаць і крадуць коней» [4, с. 64]. Цыгане Мінскай губерні раней «былі валацугамі, кралі коней і вадзілі мядзведзяў», аднак зараз аселі і пачалі займацца земляробствам [5, с. 33]. Капітан Чарніцкі заўважаў, што цыгане Магілёўскай губерні не адрозніваліся ад іншых цыган, таксама займаліся валацужніцтвам, кралі коней і падманвалі людзей [6, с. 60].

На фоне такіх даволі рэзкіх і негатыўна афарбаваных характарыстык розных этнічных груп на беларускіх землях дастаткова асобна стаяць татары, адносіны да якіх у афіцэраў Генштаба значна лепшыя. Гродзенскія татары адрозніваліся «добрай мараллю, мірнасцю і працавітасцю» [4, с. 64]. Падпалкоўнік Нордэнстэрн звярнуў увагу на татараў і караімаў Віленскай губерні, якія «адрозніваюцца своеасаблівай сумленнасцю і пакорнасцю ўладам» [3, с. 24].

Не ўсе этнічныя групы Беларусі сталі аб'ектам увагі расійскіх афіцэраў. Фактычна па-за ўвагай засталіся рускія стараабрадцы, немцы, літоўцы, латышы і інш. Прычынай гэтаму можна назваць адносна невялікую колькасць гэтых супольнасцей і, магчыма, ігнараванне іх як пэўнага стратэгічнага і тактычнага рэсурсаў пад час ваенных дзеянняў.

Такім чынам, можна дакладна казаць аб тым, што «Ваенна-статыстычныя апісанні», зробленыя афіцэрамі Расійскага Генштаба напрыканцы 40-х — пачатку 50-х гг. XIX ст., з'яўляюцца вельмі цікавай і каштоўнай крыніцай па гісторыі міжэтнічных стасункаў, адлюстроўваюць пэўныя працэсы фарміравання ў ваенна-палітычных эліт Расійскай імперыі этнічных стэрэатыпаў этнічных супольнасцей беларускіх зямель пасля іх далучэння. Абсалютна дакладна, што на ўзнікненне галоўных рысаў гэтых этнічных вобразаў уплыў аказалі рэлігійныя традыцыі Расійскай імперыі і традыцыйныя мадэлі ўспрыняцця «іншых» у расійскім грамадстве. Для этнічных вобразаў Беларусі, адлюстраваных у «Ваенна-статыстычных апісаннях», характэрны антысемітызм, падазронасць да неправаслаўных хрысціянскіх канфесій, варожасць да качавога ладу жыцця. З другога боку, актыўныя кантакты з ісламскім светам, значная колькасць мусульман у імперыі стваралі падмурак да цалкам станоўчага вобразу татараў.

Літаратура

1. Белова, О. В. Этнокультурные стереотипы в славянской народной традиции / О. В. Белова. — М.: Индрик, 2005. — 288с.

2. Бескровный, Л. Г. Очерки по источниковедению военной истории России / Л. Г. Бескровный. — М.: Изд-во АН СССР, 1957. — 454 с.
3. Военно-статистическое обозрение Российской империи. Издаваемое по высочайшему повелению при 1-м Отделении Департамента Генерального Штаба: т. IX, ч. 2. Виленская губерния / Сост. подполковник Норденстрен. — СПб.: тип. Департамента Генерального Штаба, 1848. — 56 с.
4. Военно-статистическое обозрение Российской империи. Издаваемое по высочайшему повелению при 1-м Отделении Департамента Генерального Штаба: т. IX, ч. 3. Гродненская губерния / Сост. подполковник Калмберг. — СПб.: тип. Департамента Генерального Штаба, 1849. — 142 с.
5. Военно-статистическое обозрение Российской империи. Издаваемое по высочайшему повелению при 1-м Отделении Департамента Генерального Штаба: т. IX, ч. 4. Минская губерния / Сост. поручик Стрен. — СПб.: тип. Департамента Генерального Штаба, 1848. — 60 с.
6. Военно-статистическое обозрение Российской империи. Издаваемое по высочайшему повелению при 1-м Отделении Департамента Генерального Штаба: т. VIII, ч. 3. Могилевская губерния / Сост. капитан Черницкий. — СПб.: тип. Департамента Генерального Штаба, 1848. — 61 с.
7. Военно-статистическое обозрение Российской империи. Издаваемое по высочайшему повелению при 1-м Отделении Департамента Генерального Штаба: т. VIII, ч. 1. Витебская губерния / Сост. генерал-майор Без-Корнилович. — СПб.: тип. Департамента Генерального Штаба, 1852. — 267 с.
8. Милютин, Д. А. Критическое исследование значения военной географии и военной статистики / Д. А. Милютин. — СПб.: Военная тип., 1846. — 70 с.